Источник: “Настаўніцкая газета” – 2019-06-01

# Палітра інавацый



Рэспубліканскі фестываль інавацыйнага педагагічнага вопыту сабраў на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ўдзельнікаў інавацыйнага праекта “Укараненне мадэлі фарміравання і развіцця даследчай кампетэнтнасці навучэнцаў на аснове вывучэння духоўнай і культурнай спадчыны”. Багатая і яркая палітра вопыту рэалізацыі праекта была прадстаўлена падчас тэматычнай выставы, пленарнага пасяджэння, а таксама супервізіі.

Сучаснаму навучэнцу, безумоўна, неабходна валодаць даследчымі кампетэнцыямі, аднак і ўнутраны свет дзяцей, падлеткаў, моладзі павінен удасканальвацца. Менавіта фарміраванне маральна сталай, духоўна развітой асобы, якая ўсведамляе сваю адказнасць за лёс Радзімы і народа, з’яўляецца галоўнай мэтай дзейнасці ўстаноў адукацыі, што і даказалі прадстаўнікі 16 школ і гімназій краіны, якія ўдзельнічаюць у рэспубліканскім інавацыйным праекце.



Па словах прарэктара Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктара педагагічных навук, дацэнта, старшыні Беларускага педагагічнага таварыства Галіны Іванаўны Нікалаенка, вялікую ролю ў рэалізацыі праекта адыгрывае энтузіязм і прафесіяналізм настаўніка. Калі гаварыць пра выніковасць праекта, то тут важна не толькі, што зрабілі настаўнікі, якія мерапрыемствы правялі, але і як за гэты час яны змяніліся, як прафесійна выраслі, як ставяцца да ўкаранення новага, інавацыйнага. Важна, каб рэсурс рэспубліканскага праекта стаў рэсурсам развіцця ўстановы адукацыі. Гэта і пацвердзіў фестываль — свята наватарскага мыслення, энтузіязму і творчасці.

— Наш праект пачаў рэалізоўвацца ў 2016 годзе, які быў аб’яўлены ў краіне Годам культуры. Кансалідацыя ўсіх грамадскіх сіл, дзяржавы была акцэнтавана на тым, каб духоўная і культурная спадчына стала здабыткам народа не па фармальных прыкметах, а здабыткам па сэрцы. Гэта ўзмацніла зместавы кантэнт праекта. 2017 год аб’яўлены Годам навукі. Улічваючы тое, што ключавой пазіцыяй праекта з’яўляецца фарміраванне і развіццё даследчай кампетэнцыі, навуковы складнік набыў новае гучанне. У Год малой радзімы гарманічна спалучыліся навука і культура. Гэты год даў магчымасць звярнуць увагу на культурную спадчыну рэгіёнаў, — паведаміла намеснік начальніка Цэнтра развіццёвых педагагічных тэхналогій Акадэміі паслядыпломнай адукацыі кансультант інавацыйнага праекта Таццяна Фадзееўна Пашковіч.

Асаблівасці фарміравання даследчых кампетэнцый залежаць ад спецыфікі навучальнай установы, асаблівасцей арганізацыі адукацыйнага працэсу, узросту навучэнцаў, магчымасцей сацыяльнага навуковага партнёрства. Кожная з 16 устаноў адукацыі, задзейнічаных у праекце, пайшла сваім шляхам. Нехта выкарыстоўваў багаты рэсурс Беларускай Праваслаўнай Царквы, нехта ў рамках праекта стварыў музей, нехта — анлайн-праект. Які б шлях ні выбралі ўстановы адукацыі, іх галоўнай мэтай стала фарміраванне і развіццё даследчай кампетэнтнасці навучэнцаў праз стварэнне кагнітыўна-крэатыўнага адукацыйнага асяроддзя на аснове духоўна-маральнай і культурнай спадчыны.

Ігар Грэчка. Палітра інавацый

Источник: “Настаўніцкая газета” – 2019-06-01



Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце сярэдняй школы № 6 Віцебска Н.У.Лявонкіна.

— У настаўнікаў, якія жывуць у невялікім раёне (такім як наш, Дзятлаўскі), часам надыходзіць момант, калі ім здаецца, што пра сваю малую радзіму яны разам з вучнямі даведаліся ўсё магчымае. Каб у дзяцей не знікла цікавасць да вывучэння роднага краю, мы вырашылі далучыць да гэтай справы новых людзей. Так нарадзілася ідэя рэалізацыі інтэрнэт-праектаў “Легенды і паданні зямлі пад белымі крыламі” і “Аблічча мінулай вайны”. Метад праектаў — выдатны спосаб арганізацыі выхаваўчай работы ў любой установе адукацыі, — адзначыла намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце гімназіі № 1 Дзятлава Наталля Паўлаўна Клімец.

“Настаўніцкая газета” паведамляла ўжо пра рэалізацыю праекта “Аблічча мінулай вайны”. Нагадаем, да рэалізацыі праекта дзятлаўскіх педагогаў падштурхнуў зварот у раённы ваенкамат з запытам пра колькасць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Высветлілася, што іх на Дзятлаўшчыне жыве ўсяго 8 чалавек. Неабходна было захаваць памяць пра ўдзельнікаў вайны, яе сведкаў. Дзякуючы інтэрнэт-прасторы, праект сягнуў далёка за межы Дзятлаўскага раёна і ахапіў 27 устаноў адукацыі краіны. Складаўся праект з 5 этапаў: “Ветэраны ў страі” (створана віртуальная кніга памяці), “Дзеці вайны” (сабраны звесткі пра дзяцей вайны, запісаны відэаінтэрв’ю, якія можна паглядзець на YouTube), “Ішлі дзяўчаты па вайне” (створана віртуальная кніга “Такія розныя лёсы”), “Дарогамі памяці” (відэаэкскурсіі), “Вайна ў чамадане” (абарона музейных інсталяцый на базе Інстытута гісторыі НАН Беларусі).



У сярэдняй школе № 6 Віцебска даследаванне навучэнцамі духоўнай і культурнай спадчыны малой радзімы ў рамках рэспубліканскага праекта таксама адбываецца на аснове выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій. У выніку быў створаны віртуальны музей “Беларуская хатка”, а таксама шэраг даследчых вучэбна-пазнавальных фільмаў. Па словах настаўніцы гісторыі і грамадазнаўства Ірыны Антонаўны Бабковай, сучасныя дзеці — гэта дзеці высокіх тэхналогій, таму ў адукацыйным працэсе важна актыўна выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі і прадукты, якія ствараюць самі навучэнцы. Так узнікла ідэя далучэння школьнікаў да праектна-даследчай дзейнасці шляхам стварэння вучэбна-пазнавальных фільмаў, якія потым выкарыстоўваюцца на ўроках гісторыі і ў пазакласнай рабоце.

— Кіно з’яўляецца эфектыўным выхаваўчым інструментам. Кожны з фільмаў накіраваны на вырашэнне пэўных задач, фарміраванне пэўных рыс характару, традыцыйных духоўна-маральных, культурных і сямейных каштоўнасцей, ідэалаў дабрыні і прыгажосці. Намі створаны такія фільмы, як “Помнікі паўночнай сталіцы”, “Музеі Віцебска”, “Віртуальная экскурсія па Віцебску”, “Страчаныя храмы Віцебска”, “Народная памяць”, “Гісторыя Віцебска ў помніках, музеях, храмах, вуліцах” і многія іншыя, — адзначыла Ірына Антонаўна.

Такім жа значным выхаваўчым інструментам для педагогаў сярэдняй школы № 6 Віцебска з’яўляецца віртуальны 3D-музей “Беларуская хатка”. Па словах настаўніцы інфарматыкі Вольгі Іванаўны Коршунавай, ствараўся музей з дапамогай мовы гіпертэкставай разметкі HTML і CSS, графічнага рэдактара Adobe Photoshop і праграмы

Pano для складання 3D-панарам. Для стварэння якасных фотаздымкаў музея адна з удзельніц праекта нават вучылася на курсах фатографаў.




Для калектыву Смаргонскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі работа ў інавацыйным рэжыме даволі прывычная, кожны год тут адкрываюцца новыя гурткі, рэгулярна арганізоўваюцца мерапрыемствы раённага маштабу, акцыі, рэалізоўваюцца праекты. Рэспубліканскі інавацыйны праект вельмі гарманічна ўпісаўся ў сістэму работы гэтай установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Фарміраванне даследчай кампетэнтнасці навучэнцаў цэнтра творчасці ў асноўным адбывалася праз работу “Бюро віртуальных экскурсій”, “Маладзёжнай тэлестудыі”, клуба “Дыялог на роўных” і клуба “Экасвет”.

— З’яўленне цікавых для падлеткаў інавацыйных структур, добра арганізаваная рэклама будучай дзейнасці прыцягнулі вялікую колькасць навучэнцаў з усіх устаноў адукацыі Смаргоні (больш за 80 чалавек). У навучэнцаў з’явіліся стымулы для самарэалізацыі, завязаліся стасункі з новымі людзьмі, сяброўскія адносіны, з’явілася магчымасць прыявіць сябе ў альтэрнатыўным асяроддзі. Педагогі цэнтра рэалізоўваюць нефармальны падыход зносін з навучэнцамі, што дадае шчырасць і цеплыню ў адносіны. У трох аб’яднаннях даследчая кампетэнтнасць сфарміравалася шляхам стварэння відэапрадукту, відэаэкскурсій, відэаролікаў, тэлеперадач, — падзялілася намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце Святлана Зянонаўна Балыш.



Для вывучэння адметнасцей Смаргоншчыны была арганізавана вялікая колькасць выязных экспедыцый. Дадатковыя магчымасці з’явіліся дзякуючы супрацоўніцтву з сацыяльнымі партнёрамі. Так, супрацоўнікі Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея аказвалі дапамогу ў пошуку праўдзівай, навукова пацверджанай інфармацыі, складанні тэкстаў экскурсій. Работнікі Смаргонскага доследнага лясгаса дапамагалі ў лясным масіве адшукаць помнікі прыроды. Уладальнікі аграсядзібы забяспечвалі камфортныя ўмовы ўдзельнікам экспедыцый, было арганізавана харчаванне і адпачынак, сустрэчы з мясцовымі жыхарамі, а таксама дапамога ў знаходжанні мясцовых прыродных і гісторыка-культурных аб’ектаў. Былі сабраны і вывучаны матэрыялы пра адметнасці аграгарадкоў раёна.



Маладзёжным бюро віртуальных экскурсій створана восем відэаэкскурсій. Каштоўнасць гэтых маршрутаў у тым, што яны пралягаюць праз малавывучаныя мясціны. Удзельнікамі маладзёжнай тэлестудыі створана пяць экспромт-фільмаў, 12 сацыяльных ролікаў. Дадатковым стымулам для падлеткаў стала тое, што іх творчасць змаглі ацаніць равеснікі і бацькі, настаўнікі, жыхары Смаргоншчыны, паколькі відэаролікі дэманстраваліся не толькі на смаргонскім тэлебачанні, але і размяшчаліся на сайце ўстановы, у сацыяльных сетках, створаны таксама канал на YouTube. Удзельнікі праекта атрымалі магчымасць азнаёміцца з асаблівасцямі новых для іх прафесій экскурсавода, мастацтвазнаўцы, аператара, мантажора, гукааператара, фатографа і інш.

Духоўна-маральнае выхаванне навучэнцаў сярэдняй школы № 3 Івацэвіч ажыццяўляецца праз рэалізацыю праграмы супрацоўніцтва паміж Міністэрствам адукацыі і Беларускай Праваслаўнай Царквой. Любоў да роднага слова ў сваіх выхаванцаў фарміруюць педагогі гімназіі № 14 Мінска, Ельскай дапаможнай школы-інтэрната. Дарэчы, як паведаміў дырэктар гэтай установы Якаў Дзмітрыевіч Ліпскі, калектыў школы-інтэрната актыўна ўключыўся ў праектную дзейнасць: педагогі фарміруюць даследчыя навыкі дзяцей праз вывучэнне гісторыі і асаблівасцей каляндарна-абрадавых свят Ельскага раёна, беларускага народнага тэатра “Батлейка”. Сваімі ўласнымі рукамі педагогі і навучэнцы зрабілі батлейку, лялькі для пастаноўкі спектакляў. У 2018 годзе педагагічны калектыў выдаў кнігу “Права на жыццё”, у якім расказваецца пра грунтоўны вопыт работы з асаблівымі дзецьмі. Грунтоўны вопыт фарміравання і развіцця даследчай кампетэнтнасці навучэнцаў назапашаны і ў сярэдняй школе № 55 Мінска, сярэдняй школе № 29 Брэста, Жырмунскай сярэдняй школе Воранаўскага раёна, сярэдняй школе № 16 Ліды. Педагогі кожнай установы адукацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі інавацыйнага праекта, ахвотна падзяліліся багатай палітрай свайго вопыту.

Рэспубліканскі фестываль стаў толькі прамежкавым падвядзеннем вынікаў праекта, а значыць, яшчэ абавязкова з’явяцца новыя яркія фарбы педагагічнага вопыту па фарміраванні і развіцці даследчай кампетэнтнасці навучэнцаў на аснове вывучэння духоўнай і культурнай спадчыны малой радзімы.